УДК 378.4:[008+7](476-25)+929(476)Зяневіч У.К.

# УЛАДЗІМІР ЗЯНЕВІЧ. ТВОРЧЫ ПАРТРЭТ

*(Да 60-годдзя з дня нараджэння)*




*5 мая ў канферэнц-зале Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адбылася творчая вечарына, прысвечаная 60-годдзю прафесара кафедры беларускай народнапесеннай творчасці Уладзіміра Кузьміча Зяневіча – фалькларыста, хормайстра, кампазітара і аранжыроўшчыка, імя якога добра вядома не толькі ў нашай краіне, але і далёка за яе межамі.*

*Ушанаванне юбіляра ператварылася ў сапраўднае свята беларускай песні. Гучала музыка не толькі Уладзіміра Зяневіча, але і вучняў яго класа – студэнтаў, кіраўнікоў мастацкіх калектываў, маладых выкладчыкаў, якія плённа працуюць у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў. Поспех вечарыны быў безумоўны, і забяспечылі яго выдатныя выканаўцы.*

Уладзімір Кузьміч Зяневіч нарадзіўся 2 мая 1955 г. у горадзе Жлобіне Гомельскай вобласці. З маленства ў яго праявіліся музычныя здольнасці і цікавасць да народнай песні. Паводле сямейных успамінаў, маленькі трохгадовы музыка з дзіцячым гармонікам у руках сваімі спевамі прыводзіў у захапленне дарослых, якія збіраліся на вячоркі ў хаце бабулі Марыі Феліксаўны. У дзіцячыя гады бацькі Уладзіміра Кузьміча моцна паўплывалі на лёс будучага музыканта. Маці Вікторыя Вікенцьеўна дапамагала хлапчуку складаць спеўнікі з папулярных у той час песень, якія яны распявалі на два галасы, а па патрабаванні бацькі – Кузьмы Сцяпанавіча, які сам быў аматарам музыкі (у маладосці граў на гармоніку) і падтрымліваў захапленне хлапчука светам гукаў, Уладзімір паступае ў дзіцячую музычную школу № 2 г. Мінска па класе баяна. Старшыя школьныя гады былі адзначаны стварэннем гурта і захапленнем рок-музыкай, але тут маці, якая з засцярогай ставілася да амаль бесперапынных рэпетыцый і выступленняў, што магло паўплываць на заняткі ў школе, знайшла «вакцыну» супраць гэтай «хваробы» – амаль за руку прывяла хлопца ў аматарскі народны хор. Гэты першы, дзіцячы яшчэ музычны досвед і вызначыў лёс – паступленне пасля заканчэння школы ў Мінскае музычнае вучылішча імя М. І. Глінкі.

Не парываў Уладзімір з музыкай і калі служыў ва ўзброеных сілах. Армейская музычная самадзейнасць дазваляла захаваць атрыманыя музычныя навыкі, а яшчэ была добрым адпачынкам у час нялёгкага салдацкага жыцця. Пасля арміі працягваў вучобу ў вучылішчы.

З гадамі вучобы ў вучылішчы звязаны і першы прафесійны вопыт: у 1976 г. распачаў хормайстарскую працу на пасадзе мастацкага кіраўніка

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

хору ветэранаў працы, які быў створаны ў Палацы культуры і тэхнікі Мінскага аўтамабільнага завода.

У 1977 г. Уладзімір Кузьміч паступіў у Мінскі інстытут культуры, які скончыў з адзнакай «выдатна», і з якім, як высветлілася, лёс звязаў яго на ўсё жыццё. Менавіта тут на кафедры народнапесеннай творчасці, а яшчэ ў Інстытуце філасофіі і права АН БССР, аспірантуру якога закончыў па спецыяльнасці «эстэтыка» пад кіраўніцтвам выдатнага беларускага вучонага У. М. Конана, адбывалася станаўленне светапогляду Уладзіміра Зяневіча – музыканта, навукоўца і выкладчыка.

Навуковыя прыярытэты У. К. Зяневіча былі сканцэнтраваны ў двух напрамках – праблемы інтэграцыі беларускага музычнага фальклору ў сістэме сучаснай мастацкай культуры ва ўмовах глабалізацыі і інфармацыйнага грамадства і гісторыка-культурны аспект музычнай культуры Беларусі. Па выніках даследаванняў У. К. Зяневіч выдаў шэраг артыкулаў, падрыхтаваў да выдання манаграфію «Музычная культура Беларусі: 20-я гады XX стагоддзя».

Фальклорныя экспедыцыі, якія ў 1980-я гг. рэгулярна ладзіліся ў Мінскім інстытуце культуры, пераканалі ў неабходнасці новых падыходаў да выкладання музычнага фальклору. На пачатку 90-х гг. XX ст. У. К. Зяневіч стаў ініцыятарам стварэння ва ўніверсітэце спецыялізацыі «фальклорнае мастацтва», новага кірунку па падрыхтоўцы спецыялістаў, звязанага з даследаваннем і вывучэннем аўтэнтычнага фальклору Беларусі ў кантэксце рэгіянальных жанравых і стылявых асаблівасцей. Вынікам шматгадовай выкладчыцкай дзейнасці сталі вучэбна-метадычныя працы, сярод якіх хрэстаматыя «Беларуская народная песня», фундаментальны вучэбна-метадычны дапаможнік «Аранжыроўка беларускіх народных песень», тыпавыя вучэбныя праграмы па дысцыплінах «Расшыфроўка беларускіх народных песень», «Беларуская народнапесенная творчасць», «Аранжыроўка беларускіх народных песень», «Беларуская народнапесенная творчасць. Слоўнік тэрмінаў і паняццяў».

У 1993 г. У. К. Зяневіч стварае фальклорны ансамбль «Грамніцы». З часу свайго заснавання гэты самабытны калектыў стаў сапраўднай навукова-творчай лабараторыяй па даследаванні і прапагандзе беларускай традыцыйнай культуры, інтэрпрэтацыі і папулярызацыі народнапесеннай творчасці беларусаў ва ўсім свеце. Гады цікавай натхнёнай працы ўвабралі ў сябе шматлікія выступленні на канцэртных пляцоўках роднай Беларусі, Расіі, Украіны, другіх краін. Ансамбль паспяхова прадстаўляў Беларусь у Галандыі, Францыі, Швейцарыі, Германіі, Польшчы, Латвіі, В'етнаме, Аб'яднаных Арабскіх Эміратах, удзельнічаў у прэстыжных міжнародных конкурсах і фестывалях фальклору ў Вялікабрытаніі, Рэспубліцы Карэя, Бельгіі, Швецыі, Швейцарыі, Італіі. Ансамбль выдаў некалькі кампакт-дыскаў з запісамі песеннага фальклору Беларусі, якія сталі вядомымі ва ўсім свеце, атрымалі станоўчую музычную крытыку. За гэтай сухой статыстыкай – напружаная карпатлівая творчая праца заснавальніка і мастацкага кіраўніка ансамбля Уладзіміра Зяневіча.

Жыццёвае крэда У. К. Зяневіча ярка праяўляецца ў яго пастаянным імкненні ўзняцца на ўзровень Чалавека Творчага. Гэта асабліва выразна бачыш, калі звяртаешся да яго дзейнасці як кампазітара і аранжыроўшчыка. У. К. Зяневіч – аўтар шэрагу музычных твораў для хору, вакальнага і камернага ансамбляў, аркестра, якія часта выконваюцца ў Беларусі, добра вядомыя аўдыторыі ў шмат якіх краінах свету.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асаблівае месца ў яго творчасці займаюць апрацоўкі беларускіх народных песень. Ім напісаны больш за 200 твораў, многія з якіх увайшлі ў рэпертуарныя зборнікі, метадычныя дапаможнікі, хрэстаматыі па дырыжыраванні народным хорам і класе фальклорна-выканальніцкага майстэрства. Творы У. К. Зяневіча складаюць рэпертуар харавых калектываў і фальклорных ансамбляў нашай краіны, замежных выканаўцаў. Музыка У. К. Зяневіча выяўляе арыгінальнасць мастацка-эстэтычнага погляду на нацыянальны фальклор, дэманструе творчую індывідуальнасць і самабытнасць стылю аўтара. У музычных кампазіцыях, пабудаваных на аснове фальклорных вобразаў, арганічна спалучаюцца пазнаваемая аўтарская інтанацыя і нацыянальная музычная лексіка. У аснове яго творчасці – ідэал прыгожага, высокага і трагічнага, якія, паводле ўяўленняў Уладзіміра Кузьміча, з'яўляюцца сутнасцю характарыстыкай усяго беларускага мастацтва.

У. К. Зяневіч садзейнічаў станаўленню і развіццю аматарскай мастацкай творчасці ў Беларусі. На працягу шэрагу гадоў ён з'яўляўся арганізатарам і мастацкім кіраўніком народнага хору ветэранаў працы Палаца культуры і тэхнікі Мінскага аўтамабільнага завода, заснавальнікам народнага ансамбля народнай песні «Вербіца» Палаца культуры і тэхнікі МАЗа; спрыяў развіццю харавога руху ў Беларускім дзяржаўным політэхнічным інстытуце і Беларускім інстытуце народнай гаспадаркі, з'яўляўся мастацкім кіраўніком народнага хору выкладчыкаў і супрацоўнікаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Зараз гэтую важную і адказную працу працягваюць вучні Уладзіміра Кузьміча.

У. К. Зяневіч выхаваў плеяду вучняў, якія сталі высокакваліфікаванымі спецыялістамі ў галіне культуры і мастацтва, паспяхова працуюць ва ўстановах культуры і адукацыі выкладчыкамі, кіраўнікамі і артыстамі прафесійных мастацкіх калектываў. Сярод выбітных студэнтаў, якія вучыліся ў класе Уладзіміра Кузьміча – заслужаныя артысты Рэспублікі Беларусь Уладзіслаў Місевіч, Валерый Дайнэка, Аркадзь Эскін, Аляксандр Сацура; яго вучні – Паліна Смолава, Дзяніс Ліс удзельнічалі ў фінальных спаборніцтвах прэстыжнага конкурсу Еўрабачання. Шэраг вучняў з'яўляюцца лаўрэатамі міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў выканаўцаў народнай музыкі і песень, стыпендыятамі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

У год 60-годдзя Уладзімір Кузьміч Зяневіч – адзін з найбольш вопытных і аўтарытэтных спецыялістаў у галіне беларускай народнапесеннай творчасці ў нашай краіне. Ён актыўны грамадскі дзеяч – сябра Беларускага саюза музычных дзеячаў, член спецыяльнай камісіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і творчай секцыі па вакальна-харавым мастацтве г. Мінска, актыўна працуе ў складзе журы рэспубліканскіх і міжнародных мастацкіх конкурсаў. Яго дзейнасць накіравана на пашырэнне міжнародных сувязей і кантактаў у галіне музычнага мастацтва і народнай творчасці.

У. К. Зяневіч робіць значны ўнёсак у падрыхтоўку кадраў у галіне культуры, развіццё народнага харавога мастацтва Беларусі. Яго дзейнасць неаднаразова адзначалася ганаровымі граматамі і падзякамі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, адзнакамі беларускіх і замежных арганізацый і ўстаноў культуры і мастацтва.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ